# СЭРЦА СУСВЕТУ – БАЦЬКОЎСКІ ПАРОГ

**На мяжы трох раёнаў Гродзенскай вобласці – Ваўкавыскага, Мастоўскага і Бераставіцкага ў зяляніне грыбнога лесу схавалася вёсачка з вясёлай назвай Пачуйкі. У ёй усяго 15 чалавек. Але адметнасць Пачуек у іншым – менавіта тут з'явіўся на свет, вырас і жыве беларускі паэт Мікалай Іваноўскі.**



Літаратар вядомы аматарам сучаснай беларускай паэзіі па шматлікіх выступленнях і публікацыях. З зайздроснай рэгулярнасцю на свет нараджаюцца зборнікі яго шчырай, па-народнаму немудрагелістай лірыкі і пацешных сатырычных баек. Калі б паэта спыталі – што служыць для яго крыніцай натхнення, тут, каля бацькоўскага дома, у роднай вёсачцы, у атачэнні блізкіх і сяброў адказ, здаецца, ляжыць на паверхні. Чалавеку, як высвятляецца на працягу жыцця, трэба для шчасця зусім няшмат. А калі казаць пра шчасце чалавека творчага – Мікалаю Іваноўскаму ў гэтым сэнсе скардзіцца грэх. Так, ужо ёсць прызнанне чытачоў і павага калег. Ёсць жаданне працягваць творчы пошук, гэтую гутарку-роздум з сучаснікам і з уласнай душой. Яго жыццёвая філасофія цалкам пабудавана на любові. Любоў ніколі не пакідала сэрца паэта і нават у цяжкія хвіліны дапамагала выстаяць. Яна прыходзіць на дапамогу і цяпер.

У жыцці роду Іваноўскіх заўсёды знаходзілася месца для творчасці, прыгажосці. Малодшы брат паэта Дзмітрый у свой час здолеў праславіць свой род, малую радзіму талентам мастака і за сваё, на жаль, нядоўгае жыццё істотна ўзбагаціў айчынную культуру, заявіў пра сябе нават за мяжой. У доме паэта, акрамя кніг, на бачных месцах размяшчаюцца карціны. Творы малодшага брата Дзмітрыя – памяць і гонар роду Іваноўскіх. Дарэчы, вобразу свайго таленавітага сваяка, яго творчасці і захаванню памяці пра яго літаратар шмат увагі аддае ў сваёй дэбютнай кнізе – «Нашчадкі роду Іваноўскіх». Пісьменнік распачаў бестэрміновую акцыю па зборы інфармацыі аб творчай спадчыне брата-мастака, ідзе пошук карцін Д. Іваноўскага, іх копій і рэпрадукцый у фондах музеяў, у калекцыях выяўленчага мастацтва па ўсім свеце.



**Дзмітрый Іваноўскі. Аўтапартрэт**


Паэт Мікалай Іваноўскі з сястрой Ганнай ля бацькоўскага дома

Пачуйкі… Месца, дзе любоў да бліжняга, да роднага быццам сыходзіць са старонак філасофскіх трактатаў, газетных перадавіц і ўвасабляецца ў стылі жыцця, у рэальнасці, у сутнасці рэчаў.

Разам са шчырасцю і дабрынёй трэба адзначыць сціпласць паэта. Без гэтай рысы партрэт Мікалая Пятровіча не будзе поўным. Магчыма я не арыгінальны, – сціпласць уласцівая беларусам як нацыі. Але тут асаблівы выпадак. У сціпласці гэтага чалавека нібыта ёсць спецыяльная функцыя – ахоўная. Яна абараняе паэта і яго лірычнага героя ад пошласці, коснасці, заганаў і спакусаў, на якія багаты сучасны свет матэрыялізму. Усё жыццё прысвяціўшы працы на вытворчым аб'яднанні «Гродна Азот», ён, шчаслівы бацька і дзядуля абраў адзіна магчымы для сябе лёс – Пачуйкі. Гэта яго космас, яго храм, яго рай… Усё навокал здаецца такім простым і таму дарагім сэрцу паэта: і шчымлівыя ўспаміны пра бацькоў, і магічная цішыня, і гаючае паветра, і шчодрая зямелька, і гудзенне пчолак на пчальніку…

На пачатку года Мікалай Іваноўскі адзначыў сваё 70-годдзе. Часта мы аддаём усю сваю любоў і пашану вобразам той ці іншай выбітнай асобы. Так, без іх нельга ўявіць нашу спадчыну, гістарычную памяць, грамадзянскае сумленне і нацыянальную годнасць (выбачайце за пафас). Але… Яны пазіраюць на нас з вечнасці. А мы яшчэ тут, у часовасці. Таму, пакуль яшчэ ёсць час, давайце максімальна накіроўваць цяпло нашых сэрцаў на тых, хто побач, хто яшчэ сярод нас! Святочная сустрэча з паэтам-юбілярам адбылася ля яго бацькоўскага парога і стала святам роднай вёскі. Амаль усе жыхары Пачуек сабраліся ў адзін з ліпеньскіх дзён на падворку Іваноўскіх. Гучала багата песень, музыкі і вершаў, баек і жартаў. З падарункамі і цёплымі словамі віншаванняў у госці да паэта завіталі яго сябры і паплечнікі, калегі і землякі. З музычна-паэтычнай канцэртнай праграмай «Паклон сялу і людзям, што жывуць тут» выступілі супрацоўнікі Рэплеўскага дома культуры (загадчык Марыя Генрыхаўна Гжэсяк; гукааператар-акампаніятар Станіслаў Станіслававіч Шылюк; салісткі вакальнай студыі «Ассорти» Вікторыя і Валерыя Трайгель; рэжысёр і вядучая Ілона Якаўлеўна Малчанава). Віншавалі творцу з выхадам новага зборніка вершаў – «Суквецце любові» (Мінск, «Ковчег»). Гэта з хваляваннем і захапленнем зрабілі госці ад Філіяла Мастоўскай раённай бібліятэкі «Гудзевіцкая сельская бібліятэка»: бібліятэкар

Валянціна Уладзіміраўна Пронька; удзельнікі аматарскага аб’яднання «Залаты ўзрост» Яніна Цуркан і Рэгіна Грышкевіч, а таксама госці з абласнога цэнтра, прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале са старшынёй, паэтэсай Людмілай Антонаўнай Кебіч: рэжысёр, сцэнарыст Ніна Паўлаўна Домань; дзіцячая пісьменніца, паэтэса Таццяна Сучкова; паэт Анатоль Апанасевіч і я, аўтар гэтых радкоў. У выкананні Людмілы Антонаўны прагучалі песні на яе вершы і на музыку Генадзя Кебіча. Шчырых слоў удзячнасці за цеплыню і гасціннасць заслугоўвае гаспадыня, родная сястра паэта Ганна Пятроўна. Музычна-паэтычныя сустрэчы ў Пачуйках вырашана зрабіць традыцыяй.

Бясспрэчна: тут яшчэ будзе напісана шмат па-народнаму мудрых паэтычных радкоў, будзе спета шмат застольных песень, сказана шмат слоў на роднай мове, слоў аб самым галоўным. Бацькоўскі парог творцы – сэрца яго жыццёвага сусвету.

**Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК**
Фота аўтара

«ЛіМ» № 32 12 жніўня 2022 *(у скарачэнні)*



















**Карціны**
**Дзмітрыя Іваноўскага**









**Віншавальныя словы паэту-юбіляру – ад Л. А. Кебіч, А. У. Апанасевіча, Н. П. Домань, Т. А. Сучковай**



Спявае ўдзельнік аматарскага аб’яднання «Залаты ўзрост» пры Гудзевіцкай сельскай бібліятэцы Яніна Цуркан





Мікалай Пятровіч прачытаў гасцям некалькі сваіх вершаў




Беларускі паэт Мікалай Іваноўскі з калегамі па СПБ. Ваўкавыскі раён, вёска Пачуйкі. Ліпень 2022 года